у сферы турызму, мэнеджэр канцэртна-відовішчных праграм і г.д.) выпускніку г этага этапа належыць прайсці адпаведныя аднагадзічныя спецыялізаваныя курсы з улікам працаўладкавання ці здаць адпаведныя кваліфікацыйныя экзамены па спецыялізацыі пасля 1-3 гадоў практычнай дзейнасці.

На другім этапе (1.5 г.) лепшыя выпускнікі першага этапа праходзяць агульнакультуралагічную падрыхтоўку на ступень магістра культуралогіі і прафесійную па індывідуальных праграмах. Пасля выканання пісьмовай работы (дыплома) ім прысвойваюцца кваліфікацыі ў адпаведнасці з праграмай навучання, напрыклад:

- мэнеджэр-эканаміст сацыякультурнай сферы;
- мэнеджэр-сацыёлаг сацыякультурнай сферы;
- мэнеджэр-эколаг сацыякультурнай сферы;
- мэнеджэр-праграміст сацыякультурнай сферы;
- мэнеджэр-прававед сацыякультурнай сферы;
- мэнеджэр па знешнекультурных сувязях;
- мэнеджэр па рэкламнай дзейнасці і г.д.

Пры пераходзе на шматузроўневую сістэму адукацыі ўзнікне неабходнасць перагляду вучэбных планаў, напрыклад перанясенне часткі прадметаў культуралагічнага цыкла на другі этап у аб'ёме, неабходным для атрымання ступені магістра культуралогіі, і, наадварот, пашырэнне зместу прадметаў агульнапрафесійнай накіраванасці на першым узроўні для атрымання кваліфікацыі мэнеджэр сацыякультурнай сферы.

У блізкім часе будзе неабходным і абнаўленне ад патокаў навучання ў сувязі з далейшым пашырэннем ролі і значэння спецыялізацый.

Варашылаў А.К.,
канд.пед.навук,
дацэнт

## ЗАДАЧЫ ФАРМІРАВАННЯ ПРАФЕСІЙНАЙ СВЯДОМАСЦІ САЦЫЯКУЛЬТУРНАГА РАБОТНІКА

Сучасная сацыякультурная сітуацыя характарызуецца працэсам пераходу да рынку і маркетынгу культурных паслуг. Адміністрацыйна-каманднае, бюракратычнае кіраўніцтва развіццём культуры паступова адыходзіць, хоць яго механізм яшчэ не зломлены да канца і працягвае ўплываць на сацыякультурныя працэсы. У гэтай сітуацыі падрыхтоўка спецыялістаў патрабуе вырашэння складаных праблем і пошуку новых нестандартных падыходаў.

Фарміраванне прафесійнай свядомасці сацыякультурнага работніка складаецца з двух узаемазвязаных задач навучання:

1) умацненне яго эканамічнай, кіраўніцкай падрыхтоўкі;

2) авалоданне тэхналогіяй кіравання развіццём сацыякультурнай дзейнасці асобы ў сферы вольнага часу.

Імкненне ВНУ культуры рыхтаваць спецыялістаў з акцэнтам на адным з гэтых кампанентаў не дае магчымасці сфарміраваць у іх цэласнае ўяўленне аб прафесійнай дзейнасці. Атрымліваецца так, што навучанне мэнеджэра сацыякультурнай сферы зводзіцца да падрыхтоўкі кіраўніка-адміністратара або падрыхтоўкі сацыяльнага работніка, які не ўмее абгрунтаваць і падвесці юрыдычную і эканамічную базу пад сваю дзейнасць. На наш погляд, сацыякультурны работнік гэта не толькі кіраўнік-адміністратар, што працуе ў "гушчы папер", а ў першую чаргу кіраўнік-педагог, які працуе ў "гушчы людзей", валодае ўменнямі і навыкамі кіравання развіццём асобы ў сферы вольнага часу.

Ва ўмовах пераходу да рынку сацыякультурны работнік можа ствараць "тавар", які будзе карыстацца попытам. Такім прадуктам можа быць яго арганізатарская дзейнасць, распрацоўка і пастаноўка сцэнарыяў розных форм, мерапрыемстваў, распрацоўка праграм (рэгіянальных, культурна-творчых і інш.) сацыякультурнага развіцця рэгіёна, супольнасці, групы, калектыву і асобнага чалавека. Вытворчасць такога "тавару" патрабуе спецыяльных ведаў, уменняў і дасканалага вывучэння самога чалавека, спецыфічных заканамернасцей і мадэлей паводзін пры арганізацыі вольнага часу ў сацыякультурнай сферы.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ